УДК [27+262.13]”18”

# ПАПСТВА Ў XIX СТАГОДДЗІ

**Клімуць Лада Яраславаўна,**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова (г. Магілёў, Беларусь)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Даклад прысвечаны таму, як адказвала папства на новыя выклікі жыцця ў XIX ст.*

XIX стагоддзе – гэта даволі цікавы перыяд у гісторыі каталіцкай царквы. Былі тэрыторыі, дзе адбывалася своеасаблівае адраджэнне веры, а былі такія, дзе назіраўся адносны заняпад царквы, і таму павышэнне аўтарытэту папы рымскага набывае асаблівае значэнне і для адраджэння царквы, і для спынення яе заняпаду. Гэтая тэндэнцыя праявіла сябе ў неа-ультрамантанстве.

Неа-ультрамантанства падтрымлівала дактрыну беспамылковасці вучэння папы рымскага ў пытаннях веры і маралі і сусветную юрысдыкцыю рымскага

пантыфіка. Яно супрацьстаяла галіканскай тэорыі, распаўсюджанай у каталіцкім свеце да 1789 г., якая сцвярджала, што беспамылковасць датычыцца толькі царкоўных сабораў, а незалежныя нацыянальныя цэрквы кантралюе дзяржава з прызнаннем толькі тытулярнай улады папы. Неа-ультрамантанства вызначалася сваім папулізмам, што з дапамагаю тагачасных сродкаў камунікацыі вяло да стварэння культу самога папы рымскага.

Але неабходна адзначыць, што развіццю такіх ідэй спрыяў і цэлы шэраг моцных і прывабных асоб, якія займалі папскі трон, а на погляд католікаў былі пакутнікамі. Такім быў Пій VII, які пасля паражэння Напалеона ў 1814 г. змог вярнуцца ў Рым, дзе аднавіў Таварыства Ісуса [1, с. 14].

Рэстаўрацыя Папскай вобласці была праявай кансерватыўнай рэакцыі на Французскую рэвалюцыю і напалеонаўскія войны сугучна палітыцы фон Метэрніха ў Еўропе. У той жа час католікі ў сістэме, у якой дамінавалі некаталіцкія “вялікія дзяржавы” (Брытанія, Прусія, Расія), адчувалі большую еднасць з радыкальнай палітыкай. Аднак Рым адмовіўся далучыцца да Свяшчэннага саюзу з некаталіцкімі дзяржавамі.

Але нешнія справы не былі галоўнымі праблемамі Рыму. Праціўнікі рэформ выбралі кансерватыўнага папу Льва XII (1823 – 1829). Яго кансерватызм выклікаў апазіцыю сярод карбанарыяў, і ў якасці рэакцыі на канклаве 1829 г. быў абраны ўмераны папа Пій VIII (1829 – 1830). Невялікая, але ўплывовая група французскіх католікаў-ультрамантанаў на чале з Рабэрам Фелісітэ дэ Ламенэ патрабавала, каб папа выступіў за ліберальныя рэформы. Аднак Пій быў ужо хворы падчас выбараў і памёр у лістападзе 1830 г.

Самым кансерватыўным папай XIX ст. стаў Грыгорый XVI (1831 – 1846). У той час адбылося паўстанне ў Раманы, якое Аўстрыя задушыла па просьбе папы, і гэта вымусіла ліберальны ўрад Луі-Філіпа ў Францыі пры падтрымцы Англіі арганізаваць “Мемарандум”, падпісаны амбасадорамі вялікіх дзяржаў у Рыме, які патрабаваў рэформ папскай адміністрацыі. Апазіцыя папы будаўніцтву чыгунак у сваёй дзяржаве ўспрымалася еўрапейскімі лібераламі як сімвал яго варожасці зменам. Хаця трэба адзначыць, што ў 1839 г. папа асудзіў афрыканскі гандаль рабамі.

Найдаўжэйшым у гісторыі было праўленне Пія IX (1846 – 1878). Ён абвясціў амністыю палітзняволеным і прызначыў кансультатыўны мірскі сабор.

Папства было слабым пунктам у сістэме Метэрніха, і перад рэвалюцыямі 1848 г. быў абраны ліберальны папа. У падзеях 1848 г. у Італіі папа стаў зняволеным Камітэта грамадскай бяспекі ў Рыме. Пасля яго уцёкаў у лютым 1849 г. была абвешчана Рымская рэспубліка.

Аднак аўстрыйцы вярнулі праўленне Габсбургаў у Паўночнай Італіі, а французская армія аднавіла ўладу папы рымскага. Пій быў італьянскім патрыётам, але ён быў адданы ідэі цэласнасці сваёй дзяржавы і таму быў рашучым ворагам лібералізму, асабліва з-за наступлення на царкоўную маёмасць, рэлігійныя ордэны і царкоўную юрысдыкцыю. Аднак у 1861 г. усталяваўся антыклерыкальны ўрад караля Віктора Эмануіла II.

Да 1870 г. Рым абараняў Напалеон III, на якога аказвалі ўціск французскія католікі, аднак бедствы папы моцна паўплывалі на ультрамантанаў у Еўропе, якія вырашылі змагацца за яго. Адбываюцца працэсы далейшага развіцця



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

царкоўнай дактрыны: у 1854 г. Пій выказаў догму аб Беззаганным Зачацці, а царква абвясціла догмат аб беспамылковасці папы рымскага (1870).

Пій, добры, прыгожы і дасціпны, быў першым папай, вядомым католікам як асоба. Дзякуючы сваёй папулярнасці Пій змог аднавіць мноства епіскапстваў у еўрапейскіх краінах, а таксама пашырыць каталіцкую іерархію ў місіях Афрыкі і Азіі; таксама адбываўся росквіт каталіцкай царквы ў ЗША і Брытанскай імперыі дзякуючы еўрапейскім, і ў першую чаргу ірландскім, імігрантам.

Папа будаваў чыгункі ў сваёй дзяржаве, захапляўся англійскай прамысловасцю і набыў параход у Англіі пад назвай “Беззаганнае зачацце” [1, с. 18]. Аднак гэта на перашкаджала яму ў шэрагу дакументаў асуджаць лібералізм [2, с. 285]. Але такія дакументы апісвалі ідэальны свет, дзе ўсе – каталікі, а не рэальны, дзе царкве трэба было ісці на кампраміс. Пія крытыкуюць за тое, што ён звязаў каштоўнасці царквы са старым сацыяльным парадкам, і не прызнаў тыя элементы лібералізму, якія з’яўлялілся параджэннем хрысціянства.

Рэакцыя еўрапейскіх лібералаў была варожай. Можна ўспомніць і няпростыя адносіны папы з Вікторам Эмануілам II, і “культурную барацьбу” у Прусіі. Аднак пры ўсім тым менавіта Пій стварыў сучаснае паптсва: не дзяржаву як такую, а глабальную духоўную ўладу.

Нашчадкам гэтай супярэчлівай спадчыны стаў Леў XIII ((1878 – 1903). Умелы дыпламат і адміністратар, ён лічыўся занадта ліберальным, а яго мараю было адраджэнне каталіцкага хрысціянскага свету.

У адраджэнні каталіцкага інтэлектуальнага жыцця Леў звяртаўся да XIII ст. Філасофія грамадства Льва паходзіла з дактрыны натуральнага права Фамы Аквінскага. Аднак гэтая філасофія была накіравана на патрэбы сучаснага хрысціянскага свету. З’яўляліся каталіцкія газеты, кааператывы, моладзевыя арганізацыі, а кардыналы-папулісты давалі рэкамендацыі рабочым арганізацыям. Гэтаму палітычнаму руху Леў даў сваю філасофію. Яго мадэль грамадства была пабудавана не на класавай барацьбе ці сацыяльнай роўнасці, а на ідэале гармоніі, у якой няроўныя паміж сабой класы ў традыцыйнай іерархіі займаюцца дабрачыннасцю і памяркоўныя адзін да аднаго.

Гэта традыцыйнае каталіцкае вучэнне, да якога Леў дадаў сваё асуджэне і капіталізму, і сацыялізму. Самая знакамітая праява гэтых поглядаў – энцыкліка 1891 г. *Rerum Novarum*, ці, як яе пазней назвалі, “хартыя рабочых” [2, с. 325]. Энцыкліка абараняла прыватную ўласнасць, але не эгаістычнае яе выкарыстанне. Агульнае з сацыялізмам у Льва – гэта дактрына дзяржавы і антыіндывідуалізм.

Палітычны кантэкст вучэння Льва – спроба аднавіць адносіны з вялікімі еўрапейскімі дзяржавамі. Аднак на справе ні ў Францыі, ні ў Ірландыі вялікіх дасягненняў не атрымалася.

Дактрына Льва – гэта інтэлігентны кансерватызм, а не лібералізм. Абсалютная большасць з 75 энцыклік Льва былі поўнасцю рэлігійнымі, аднак глабальнымі ў сваёй накіраванасці і бачанні. Ён спадзяваўся аднавіць еўрапейскае хрысціянства са справядлівым сацыяльным парадкам пад кіраўніцтвам папы, з ясным вучэннем і разумнай дыпламатыяй для яго ўвасаблення.

Можна падсумаваць, што дзейнасць чатырох вялікіх папаў XIX ст. адштурхнула многіх католікаў, аднак менавіта яны вялі царкву, якая расла і квітнела, у новую эпоху.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Літаратура

1. The Cambridge History of Christianity: in 9 v. / Edited by S. Gilley, B. Stanley. – Volume 8: World Christianities c.1815–c.1914. – Cambridge University Press, 2006. – 683 p.

2. Church and State through the Centuries: A Collection of Historic Documents with Commentaries / S.Z. Ehler and J.B. Morrall (eds.). – London: Burns and Oates, 1954. – 625 p.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова